

БАБІНАГА ЛЕТА НЕ БУДЗЕ? 4

ЛЮБОЎ — СУПРАЦЬ ТЭЛЕФОННЫХ МАХЛЯРОЎ 13



Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

+TV ПРАГРАМА

23 ВЕРАСНЯ 2022 г. ПЯТНІЦА № 187 (29809)

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Сяргей ШЛЫЧКОЎ, старшыня Дзяржаўнага камітэта па навуцы і тэхналогіях:**

*«У Беларусі развіваецца сетка навукова-тэхналагічных паркаў. Яны створаны ва ўсіх абласных цэнтрах і іншых гарадах. Ключавы вынік іх дзейнасці — стабільны рост аб'ёмаў выраблена рэзідэнтамі інавацыйнай і высокатэхналагічнай прадукцыі. У тэхнапарках, а іх сёння 16, магчыма любая навуковая, навукова-вытворчая і інавацыйная дзейнасць. Галоўная задача тэхнапарка — садзейнічанне рэзідэнтам у рэалізацыі іх праектаў. Доля рэзідэнтаў, якія займаюцца IT-тэхналогіямі, складае больш за 18 % і ўвесь час расце».*

# ВОСЕНЬ — РАБОТ ВОСЕМ



Яўген ХМЯЛЬНІЦКІ і Мікалай ЗАХАРАНКА — механізатары аднаго з найлепшых на Аршаншчыне сельскагаспадарчага прадпрыемства «Ларынаўка». Ад прафесіяналізму і старання хлебаробаў у шмат чым залежыць і поспех гаспадаркі. Гэтымі днямі Яўген засявае палеткі азімымі збожжавымі і рапсам. Мікалай, скончыўшы жніво, на якім ён быў камбайнерам, скірдуе цюкаваную салому. Завяршыўшы работу на гэтых участках, Мікалай і Яўген пяройдуць на нарыхтоўку спелай кукурузы.

**Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.**

## КОРАТКА

- **Тэлефонная размова Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі і Прэзідэнта Кыргызстана Садыра Жапарава адбылася 22 верасня па ініцыятыве кыргызскага боку. Асноўнымі тэмамі сталі актуальныя пытанні двухбаковых адносін і сітуацыя на кыргызска-таджыкскай граніцы.**
- Легендарны 90-тонны БелАЗ стане экспанатам на ВДНГ у Маскве.
- **Мінсувязі выпусціла ў абарачэнне паштовы блок да 1030-годдзя праваслаўя.**
- Экспарт МТЗ за студзень—жнівень вырас на 24,7 працэнта да ўзроўню мінулага года.
- **Укараненне аўтаматызаванай сістэмы ўліку электраэнергіі плануецца завяршыць да канца 2025 года.**

### Жыллё маё

# КВАТЭРЫ БУДУЦЬ І ДАЛЕЙ ТАННЕЦЬ, ТОЛЬКІ НЕ СПЯШАЮЧЫСЯ І ПА ЛЕДЗЬ-ЛЕДЗЬ

**Вы чулі, што аднапакаёвыя кватэры ў Мінску (прапанова) патаннелі больш чым на адзін працэнт усяго за тыдзень? І нічога, рынак не ўпаў. У той жа час двухпакаёвыя кватэры патаннелі ўсяго на 0,7 %, а цана трохпакаёвых — наогул застыла. На думку нашага эксперта, ганаровага старшыні Беларускай асацыяцыі «Нерухомасць», дырэктара Агенцтва нерухомасці «БЕЛЦГН» Мікалая ПРАСТАЛУПАВА, калі на рынку нерухомасці прапанова свабодных кватэр працягвае расці з паказчыкам 2 % у тыдзень, тут як ні круці, а кватэры вымушаныя таннець.**

## Прапанова будзе расці далей?

Так і адбылося, за гэты час цана квадратнага метра знізілася на 0,6 %, лічаць аналітыкі партала Realt. Па іх інфармацыі, база прапаноў папоўнілася за кошт размяшчэння асобнымі агенцтвамі сталіцы новых аб'яў аб продажы ад аднапакаёвых да шматпакаёвых кватэр пераважна ў новабудоўлях Кастрычніцкага раёна.

СТАР. 4

### Аднаўляльныя рэсурсы

# ПЯЦЬ ПАВЕРХАЎ ПАД ВАДОЙ

**Адзін з найбуйнейшых аб'ектаў гідраэнергетыкі краіны адзначае дзесяцігадовы юбілей**



**Пры слове «гідраэлектрастанцыя» перад вачыма паўстае плаціна, з якой бурным патокам падае вада. Але такая карціна назіраецца толькі на імклівых, вялікіх рэках, такіх, напрыклад, як Ангара, Енісей ці Волга, дзе працуе нават не адна, а тры-чатыры гідраэлектрастанцыі. Раку Нёман у гэтым сэнсе можна назваць павольнай, і ўсё ж пачынаць развіццё гідраэнергетыкі было вырашана менавіта з яе. У сувязі з юбілеем Гродзенскай ГЭС для журналістаў быў арганізаваны прэс-тур.**

СТАР. 3

ISSN 1990 — 763X

ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СА «ЗВЯЗДОЙ» ЦЯПЛЕЙ І ЎТУЛЬНЕЙ!

Ідзе падпіска на IV квартал 2022 года.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ ВОСЕННЮ І ЗІМОЙ. БУДЗЕ ЦІКАВА!

З першых вуснаў

# «МЫ Ў РАБОЧЫМ РЭЖЫМЕ ПАГАВОРЫМ І АБ ЭКАНОМІЦЫ, І АБ ПАЛІТЫЦЫ, І АБ ВАЕННА-ТЭХНІЧНЫМ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ»

## Аляксандр Лукашэнка праанансаваў сваю размову з Сі Цзіньпінам

**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка правёў рабочую сустрэчу з першым віцэ-прэзідэнтам кітайскай карпарацыі CITIC Construction Co., Ltd Янам Цзяньцанам.**

Карпарацыя, створаная ў лістападзе 2002 года, з'яўляецца дачэрняй кампаніяй найбуйнейшай дзяржаўнай фінансавай карпарацыі Кітая CITIC Group. Асноўныя напрамкі дзейнасці кампаніі — будаўніцтва пад ключ аб'ектаў нерухомасці, экспартна-імпартныя пастаўкі механічнага і электроннага абсталявання. Кампанія рэалізоўвае праекты ў краінах СНД, Паўднёва-Усходняй Азіі, Паўднёвай Амерыкі, Блізкага Усходу, Афрыкі. У 2007 годзе ў ліку адной з першых кітайскіх інжынірынгавых кампаній пачала дзейнасць на тэрыторыі Беларусі. З удзелам кампаніі ў якасці генпадрадчыка рэалізаваны праекты па будаўніцтве «пад ключ» цэментных заводаў ААТ «Беларускі цэментны завод», ААТ «Крычаўцэментнашыфер», ААТ «Красносельскбудматэрыялы», па зборцы легкавых аўтамабіляў (Белджы) на 2012—2030 гады. Цяпер кампанія рэалізоўвае ў Беларусі тры інвестыцыйныя праекты — па будаўніцтве абагачальнага калійнага камбіната для ЗТАА «Слаўкалій», шматфункцыянальнага гасцінічна-дзелавога комплексу ў Мінску ў раёне праспекта Пераможцаў і высокатэхналагічнай аграпрамысловай вытворчасці поўнага цыкла для ЗАТ «БНБК».



Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што яму трэба абмеркаваць шэраг пытанняў з прадстаўніком карпарацыі CITIC, каб грунтоўна парыхтавацца да хуткай сустрэчы са Старшынёй Кітайскай Народнай Рэспублікі Сі Цзіньпінем. «Мы правялі грунтоўную і змястоўную сустрэчу на зямлі Самарканда са Старшынёй, абмеркавалі ўсе эканамічныя пытанні нашага ўзаемадзеяння, у тым ліку і пытанні, якія ўваходзяць у сферу вашай кампетэнцыі і адказнасці. І дамовіліся, што пасля 20-га з'езда КПК мы ў рабочым рэжыме пагаворым і аб эканоміцы, і аб палітыцы, і аб ваенна-тэхнічным супрацоўніцтве. Таму мне трэба высветліць шэраг пытанняў, якія звязаны з вашай кампаніяй, — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы. — Я вельмі спадзяюся, што ваш цяперашні візіт не проста растлумачыць сітуацыю па некаторых праектах, і мы зможам абгаварыць тэрміны завяршэння гэтых праектаў, але і ваш візіт дасць магчымасць зазірнуць у будучыню нашых адносін, асабліва ў будаўнічай галіне».

Прэзідэнт заўважыў, што кампанія CITIC гатова працаваць у Беларусі і будаваць па самых сучасных тэхналогіях шэраг прадпрыемстваў. «Мы гэта вітаем», — адзначыў ён.

У сваю чаргу Ян Цзяньцан прызнаўся, што ён шчыры і цвёрды прыхільнік Аляксандра Лукашэнкі. Ён падкрэсліў, што ў Кітаі шмат тых, хто падтрымлівае беларускага Прэзідэнта. «Я пачаў працаваць у Беларусі з 2007 года, і гэтыя 15 гадоў я быў адказны за рэалізацыю шэрагу іншых інвестыцыйных праектаў у вашай краіне. Сёння гэта дзявяты раз, калі я знаходжуся побач з вамі на такой блізкай адлегласці. Для мяне гэта вялікі гонар», — падзяліўся Ян Цзяньцан. Ён падзякаваў беларускаму лідару за падтрымку карпарацыі і выканаў даручэнне свайго кіраўніцтва — перадаў Аляксандру Лукашэнку прывітанне і найлепшыя пажаданні, перш за ўсё пажаданні моцнага здароўя.



«За гэтыя 15 гадоў я на ўласныя вочы пераканаўся, як стабільна развівалася Беларусь пад вашым кіраўніцтвам, як больш шчаслівым станавіўся беларускі народ і як прыгажэйшым рабілася асяроддзе Беларусі — як квітнеючы сад. Я таксама заўважыў, што прафесійны ўзровень і кваліфікацыя нашых беларускіх партнёраў, перш за ўсё будаўнікоў, гэтак жа моцна ўзрасла, яны дасягнулі міжнароднага ўзроўню», — адзначыў віцэ-прэзідэнт карпарацыі.

**Валерыя СЦЯЦКО.**
**Фота БелТА.**

### У тэму

### «Мы плануем больш прыцягваць мясцовую рабочую сілу»

У размове з журналістамі Ян Цзяньцан падкрэсліў, што сустрэча з Прэзідэнтам была плённай і рэзультатыўнай. Кампанія атрымала падтрымку і спадзяецца рэалізаваць у Беларусі новыя праекты, запатрабаваныя нашай эканомікай. У прыватнасці, такія тэхналагічныя праекты, як трэцяя чарга праекта БНБК, якая прадугледжвае арганізацыю вытворчасці вітамінаў групы B і C, а таксама прыцягненне інвестыцый у праекты галіны сельскай гаспадаркі.

Як расказаў віцэ-прэзідэнт CITIC Construction, да рэалізацыі гэтых праектаў будуць актыўна прыцягвацца беларускія спецыялісты. «Пандэмія прынесла шмат праблем у рэалізацыі нашых праектаў у Беларусі. Узніклі цяжкасці з прыцягненнем у Беларусь кітайскай рабочай сілы, гэта стала праблематычна і эканамічна нявыгадна. Таму мы плануем больш прыцягваць мясцовую рабочую сілу, супрацоўнікаў беларускіх кампаній. За больш чым 10 гадоў работы на беларускім рынку мы пераканаліся і ўбачылі на свае вочы, як моцна вырасла кампетэнцыя і прафесійны ўзровень беларускіх будаўнічых кампаній. Магу прывесці некалькі прыкладаў кампаній, з якімі мы супрацоўнічалі: «Гомельпрамбуд», «Гроднапрамбуд», шэраг пастаўшчыкоў металаканструкцый, кампаніі, задзейнічаныя ў сферы электрамантажных работ. Мы маем намер і хочам у будучыні больш прыцягваць беларускія кампаніі ў якасці нашых субпадрадчыкаў для рэалізацыі праектаў у Беларусі», — расказаў Ян Цзяньцан.

Супрацоўніцтва

# ВЯЛІКАЯ КОЛЬКАСЦЬ КАНТРАКТАЎ

**Прэм'ер-міністр Беларусі Раман ГАЛОЎЧАНКА падвёў вынікі афіцыйнага візіту ўрадавай дэлегацыі ў Казань і Уфу.**

«Татарстан і Башкартастан — прамыслова развітыя рэгіёны, і ў нас даўнія дзелавыя сувязі. Цяпер трэба было, умоўна кажучы, крыху прарэвізаваць сітуацыю ў сувязі з санкцыйным ціскам, неабходнасцю забеспячэння бесперабойнай работы прадпрыемстваў. Таму мы з сабой прывезлі вялікую дзелавую дэлегацыю. Добра — усе тут знаёмыя паміж сабой, не трэба нікога прадстаўляць. Але неабходна было зверыць гадзіннікі і прыняць аператыўныя рашэнні па забеспячэнні бесперабойных узаемных паставак і, самае галоўнае, нарошчванні аб'ёмаў выпуску прадукцыі», — адказаў Раман Галоўчанка, перадае БелТА.

Візіт ужо зараз можна ацаніць як дастаткова паспяховы, адзначыў прэм'ер-міністр. «Вялікая колькасць камерцыйных кантрактаў і ў Татарстане, і ў Башкартастане заключаны. Акрамя камерцыйных кантрактаў, мы адпрацавалі фактычна задачу паставак на наступны год. Гэта патрэбна для таго, каб кіраўнікі прадпрыемстваў правільна спланавалі сваю вытворчую праграму. У прынцыпе, у нас ужо праблема не столькі ў заказах, колькі ў здольнасці забяспечыць выкананне ўсіх гэтых заказаў, — адзначыў кіраўнік беларускага ўрада. — Таму што, вядома, вялікі попыт на беларускую прадукцыю, у першую чаргу машынабудаўнічую. Тэма імпартазамяшчэння вельмі да месца. Напрыклад, нават праводзячы перагаворы з «КАМАЗам», найбуйнейшым расійскім вытворцам, бачым, што менавіта беларуская прамысловасць з'явілася той выратавальнай камізэлькай і дазволіла «КАМАЗу» захоўваць высокія аб'ёмы вытворчасці з пункту гледжання пастаўкі камплектавання вырабаў беларускай вытворчасці. Адпаведна тут ёсць канкрэтныя прыклады ўзаемадзеяння і інтэграцыйнага імпартазамяшчэння».

«Я ўпэўнены, што кожны кіраўнік беларускіх прадпрыемстваў дадому вязе ў партфелі або кантракты, або грошы, або дакладныя дамоўленасці на наступны год», — канстатаваў Раман Галоўчанка.

Блізкая ўлада

# ВЫКАНКАМЫ НА СУВЯЗІ

**Практыка правядзення прамых ліній рэгіянальнай вертыкаллю працягваецца. Калі ў вас ёсць пытанні або праблемы, якія патрабуюць умяшання органаў улады, тэлефануйце.**

**Тэлефонныя лініі ў суботу, 24 верасня, з 9.00 да 12.00 правядуць:**

- наместнік старшыні Брэсцкага аблвыканкама Дзмітрый Мікалаевіч ГАРАДЗЕЦКІ. Тэл. 8 016 221 31 21;
- наместнік старшыні Віцебскага аблвыканкама Анжаліка Аляксандраўна НІКІЦІНА. Тэл. 8 021 222 22 22;
- наместнік старшыні Гомельскага аблвыканкама Уладзімір Аляксандравіч ПРЫВАЛАЎ. Тэл. 8 023 233 12 37;
- наместнік старшыні Гродзенскага аблвыканкама Віктар Францавіч ПРАНЮК. Тэл. 8 015 273 56 44;
- кіраўнік спраў Магілёўскага аблвыканкама Мікалай Леанідавіч ДЗЯДКОЎ. Тэл. 8 022 250 18 69;
- наместнік старшыні Мінскага аблвыканкама Іван Станіслававіч МАРКЕВІЧ. Тэл. 8 017 500 41 60;
- наместнік старшыні Мінскага гарвыканкама Арцём Мікалаевіч ЦУРАН. Тэл. 8 017 222 44 44.

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### Страты ад энергетычнага крызісу ў Еўропе дасягнулі паўтрыльёна еўра



Бюджэтны цяжар еўрапейскіх краін ад выдаткаў на змякчэнне энергетычнага крызісу працягвае расці, паведаміла Bloomberg са спасылкай на даныя аналітычнага цэнтра Bruegel. Краіны Еўрапейскага саюза ўжо выдзелілі 314 мільярдаў еўра на змякчэнне наступстваў энергетычнага крызісу для спажыўцоў і прадпрыемстваў. Вялікабрытанія выдаткавала 178 мільярдаў еўра. Выдаткі на барацьбу з наступствамі энергетычнага крызісу зараз дасягнулі 1,7 працэнта ВУП Еўрасаюза. Удакладняецца, што гэта звязана ў першую чаргу з тым, што еўрапейскія краіны сутыкаюцца з інфляцыяй, якая паскараецца, і змрочнымі эканамічнымі перспектывамі. Даследчык з кампаніі Bruegel Сімонэ Тальяп'етра лічыць, што рост выдаткаў энергетычнага крызісу пагражае паглыбіць эканамічны разрыў паміж краінамі ЕС. Еўрапейскія ўлады абмяркоўваюць надзвычайны план для пераадолення энергакрызісу. Разглядаецца варыянт перадачы звышдаходаў энергетычных кампаній уразлівым хатнім гаспадаркам і прадпрыемствам, абмежаванне цэн на электраэнергію і зніжэнне спажывання.

### 48 мільёнаў чалавек знаходзяцца на мяжы выжывання



18 мільёнаў чалавек у свеце ўвесь час адчуваюць крайні голад, яшчэ 30 мільёнаў жыхароў нашай планеты блізкія да гэтага. Такая тэндэнцыя адзначаецца ў дакладзе аб'яднання дабрачынных арганізацый Oxfam. Арганізацыя канстатуе, што з 2016 года колькасць галадаючых у дзесяці краінах, якія найбольш церпяць ад згаданай праблемы (Самалі, Гаіці, Джыбуці, Кеніі, Нігеры, Афганістане, Гватэмале, на Мадагаскары, у Буркіна-Фасо і Зімбабвэ), павялічылася на 123 працэнты. Спецыялісты Oxfam называюць у якасці прычын узнікнення голаду канфлікты, эканамічныя крызісы і экстрэмальныя з'явы надвор'я — засухі, разбуральныя паводкі, наступленне пустыні. Пры гэтым, як падлічылі ў Oxfam, на дапамогу галадаючым, па сёлетнім запыце ААН у 49 мільярдаў долараў, хапіла б прыбытку кампаній, занятых у здабычы выкапнёвых энергарэсурсаў, атрыманага за 18 дзён.

### У порце Ратэрдама канфіскавалі больш чым паўтары тоны какаіну



Прадстаўнікі мытнай службы Нідэрландаў выявілі і канфіскавалі дзве партыі какаіну ў порце Ратэрдама. Агульная вага знойдзенага наркатычнага сродку склала 1527 кілаграмаў, паведаміла газета NL Times. Першая партыя какаіну вагой 450 кг была знойдзена паміж бляшанкамі спаржы, якая была адпраўлена з Перу для кампаніі ў Іспаніі. Неўзабаве мытня выявіла таксама 1077 кілаграмаў какаіну сярод партыі гітар з ЗША. Інструменты прызначаліся для галандскай кампаніі. Дзяржаўная пракуратура Нідэрландаў ацаніла «вулічны кошт» наркотыкаў у больш чым 114 мільёнаў еўра.

Акцэнты

# СПРАВЯДЛІВАСЦЬ, РАЎНАПРАЎЕ, ШМАТБАКОВАСЦЬ

## Уладзімір Макей расказаў у ААН аб прыярытэтах Беларусі

**Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір МАКЕЙ у Нью-Ёрку ўзяў удзел у нефармальнай сустрэчы кіраўнікоў МЗС АДКБ на палях сесіі Генеральнай Асамблеі ААН, паведамілі ў МЗС Беларусі.**

Уладзімір Макей праінфармаваў аб прыярытэтах Беларусі на 77-й сесіі ГА ААН: пашырэнне прынцыпаў справядлівасці, раўнапраўя і шматбаковасці, павагі да суверэнітэту дзяржаў, недапушчальнасці прымянення аднабаковых прымусовых мер і санкцый у парушэнне Статута ААН. Міністр адзначыў, што важным складнікам пазіцыі Беларусі на Генеральнай Асамблеі будзе заклік да процістаяння дыскрымінацыйнай практыцы ў ААН па дзяржпрыкмеце, палітыцы «культуры адмены», адвольным выключэнні дзяржаў з міжнародных структур, нявыдачы віз афіцыйным прадстаўнікам і іншым.

Беларусь таксама сканцэнтруе свае намаганні на процідзеянні краінавым мандатам і антыбеларускім ініцыятывам; пашырэнні чарнобыльскай праблематыкі; умацаванні каардынацыі міжнародных намаганняў па барацьбе з гандлем людзьмі; падтрымцы натуральнай сям'і. Уладзімір Макей нагадаў аб ініцыятыве Прэзідэнта Беларусі аб пачатку глабальнага працэсу з уключэннем усіх міжнародных гульцоў у духу Сан-Францыска, вынікам якога павінны стаць зразумелыя, празрыстыя дамоўленасці аб правілах новага сусветнага правапарадку. Міністр таксама заклікаў да неабходнасці выпрацоўкі прынцыпаў карпаратыўнай салідарнасці, прапанаваў выпрацаваць адпаведны механізм у АДКБ.

У рамках удзелу ў сустрэчы міністраў замежных спраў дзяржаў — удзельніц Руху недалучэння (РН) Уладзімір Макей прыцягнуў увагу да прапаноў беларускага боку, якія датычацца ролі ААН у бягучых геапалітычных рэаліях. Гэтыя прапановы былі накіраваны ў адрас дзяржаў — членаў ААН напярэдадні 77-й сесіі Генеральнай Асамблеі. Міністр выступіў за неабходнасць нарошчвання патэнцыялу краін, якія сталі на шлях развіцця, у пошуку адказаў на выклікі сучаснасці. Сёння, калі супрацьстаянне паміж буйнымі геапалітычнымі гульцамі дасягнула пагрозлівых маштабаў, менавіта краіны, якія развіваюцца, згуртаваўшыся, павінны ўзяць на сябе лідзіруючую ролю ў вырашэнні крызісу міжнародных адносін. Але гэта можа стаць магчымым толькі ва ўмовах еднасці і салідарнасці. У адваротным выпадку, любая, асабліва невялікая, краіна можа стаць чарговай ахвярай эгаістычных інтарэсаў Захаду.

Уладзімір Макей акрэсліў сапраўдныя прычыны ўвядзення незаконных эканамічных санкцый у дачыненні да Беларусі, у прыватнасці, закрыцця беларускай паветранай прасторы і забароны на палёты беларускіх авіяперавозчыкаў. Падрабязна праінфармаваў аб пазіцыі Рэспублікі Беларусь па ўкраінскім канфлікце, звярнуўшы асаблівую ўвагу на тое, што наша краіна не з'яўляецца бокам гэтага канфлікту і заўсёды прадстаўляла пляцоўку для мірнага дыялогу.

Узяўшы ўдзел у пасяджэнні высокага ўзроўню Генеральнай Асамблеі ААН з нагоды 30-годдзя прыняцця Дэкларацыі аб правах асоб, якія належаць да нацыянальных або этнічных, рэлігійных і моўных меншасцяў, міністр прыцягнуў увагу да тэмы генацыду беларускага народа ў ходзе Другой сусветнай вайны і жахаў Халакосту.

«Дзякуючы створанай у Беларусі моцнай сістэме абароны і падтрыманню правоў і свабод нацыянальных, этнічных, рэлігійных і моўных меншасцяў, прадстаўнікі ўсіх нацыянальнасцяў лічаць Беларусь сваім домам», — адзначыў Уладзімір Макей на пасяджэнні ГА ААН высокага ўзроўню з нагоды 30-годдзя прыняцця Дэкларацыі аб правах асоб, якія належаць да нацыянальных або этнічных, рэлігійных і моўных меншасцяў.

«Беларусь дзякуючы сваёй гісторыі і геаграфічнаму становішчу на сённяшні дзень з'яўляецца шматнацыянальнай дзяржавай, — падкрэсліў кіраўнік беларускага знешнепалітычнага ведамства. — Прайшоўшы ў сваёй гісторыі праз многае, у тым ліку генацыд беларускага народа ў час Другой сусветнай вайны і ўсе жахі Халакосту, мы назаўсёды замацавалі ў сваёй грамадскай і нацыянальнай свядомасці адмаўленне любой міжэтнічнай, міжкультурнай і міжканфесіянальнай варожасці».

Уладзімір Макей са шкадаваннем адзначыў, што пытанні нацыянальнасці, рэлігіі і мовы часта становяцца інструментам і прыкрыццём для супрацьзаконнай дзейнасці. Ён падкрэсліў, што за апошнія некалькі гадоў Беларусь неаднаразова фіксавала і спыняла спробы знешніх сіл уплываць на палітычнае жыццё краіны з выкарыстаннем моўнага і нацыянальнага фактараў. Як адзначыў міністр, некаторыя суседзі Беларусі навучыліся маніпуляваць інфармацыйнымі фэйкамі наконт сітуацыі з нацыянальнымі меншасцямі ў краіне і распаўсюджваюць шчырую хлусню. Адказнае суседства з'яўляецца залогам таго, што фактар нацыянальных меншасцяў стане не раздзяляючым, а, наадварот, — тым, які ўзбагачае развіццё ўсіх бакоў. У сучаснай Беларусі пражываюць прадстаўнікі амаль 100 нацыянальнасцяў, якія размаўляюць на 164 родных ім мовах і вызнаюць усе асноўныя сусветныя рэлігіі. Як заявіў Уладзімір Макей, наша краіна гатовая прыняць у сябе прадстаўнікоў розных народаў, якія будуць удзельнічаць у будаўніцтве і развіцці незалежнай і квітнеючай Беларусі.

**Пётр ДУНЬКО.**

# ПЯЦЬ ПАВЕРХАЎ ПАД ВАДОЙ




### На верхавіне «айсберга»

Гідратэхнічны аб'ект размешчаны за некалькі дзясяткаў кіламетраў ад Гродна. Пры пад'ездзе транспарт сустракае мясцовы ахоўнік. Пасля неабходных фармальнасцяў журналістаў прапускаюць на тэрыторыю ГЭС. Пазней нам растлумачылі, што ўся тэрыторыя станцыі знаходзіцца пад відэакантролем, устаноўлена і інфрачырвоная прамянёвая сігналізацыя.

За варотамі звяртае на сябе ўвагу вялікі валун, дзе на гранітнай пліце выдзяляецца надпіс «Гродзенская ГЭС. Магутнасць 17 КВт». Праз бетонны мост праходзім да пляцоўкі, на якой высіцца калоны з перакрыццем. Увогуле, уражвае масіўнасць і неверагодная колькасць бетону. І гэта толькі тое, што на паверхні. Як заўважылі прадстаўнікі прадпрыемства «Гроднаэнерга», надводная частка ГЭС — толькі верхавіна айсберга, асноўны патэнцыял схаваны пад вадой — на глыбіні, роўнай вышыні пяціпавярховіка.

Але аб гэтым пазней, а пакуль ідзе агляд прыгожага наваколля. Унізе, каля самай вады, бетонны выступ аблепілі бакланы. Кажуць, яны прылятаюць туды, дзе шмат рыбы. Так і ёсць, пацвердзілі нашы гіды. Раней тут і рыбакі затрымліваліся, але цяпер перамясціліся на некалькі кіламетраў уніз па цячэнні. Чуваць, там сапраўдны рыбацкі Шанхай, а вось у зоне ГЭС засталіся толькі птушкі, у тым ліку даволі рэдкія. Напрыклад, нам удалося назіраць велічны палёт арланаў-белахвостаў і шэрых чапляў.

А вось з чым раз-пораз прыходзіцца сутыкацца работнікам станцыі, дык гэта са смеццем. Для ачысткі нават ёсць спецыяльны кран, работа якога была прадэманстравана перад журналістамі. Асабліва напружана было з гэтым у пачатку пуску станцыі. Тут настолькі



вялікія аб'ёмы раскі, што даводзіцца арандаваць баржу з экскаватарам, каб яе сабраць. Грузілі па два-тры прычэпы ў дзень.

— Тады заставаліся затопленыя дрэвы, карчы, пні, мы іх ліквідавалі падчас будаўніцтва, і цяпер узялі на сябе абавязацельства кожную вясну напярэдадні суднаходнага перыяду выконваць работы па ачыстцы вады ад гэтых дрэў. Бо смецце ў любым выпадку прыплыве да нас, таму гэта яшчэ і пытанне бяспекі станцыі, — адзначыў **дырэктар філіяла РУП «Гроднаэнерга» Віктар ЗУБРЫЦКІ.** — Хоць прыроднага смецця становіцца менш, ёсць праблема з бытавым смеццем, якое трапляе ў ваду са стыхійных месцаў адпачынку. Мы — своеасаблівы фільтр для горада.

А летась, напрыклад, прыйшлося ліквідаваць нават тарфяны астравок, плошчай больш за дзве тысячы квадратных метраў. Тады дапамаглі рачнікі — адбуксавалі яго катарам да берага, а потым сабралі экскаватарам. Асабліва адказным перыядам для станцыі з'яўляецца паводка. Тут трэба быць, як той казаў, напагатове, бо ў гэты час станцыя працуе з максімальнай магутнасцю.

Дарэчы, для фотакарэспандэнтаў была арганізавана прагулка на катары. Па іх ураЖаннях можна было меркаваць, што яны зрабілі нямала відовішчных здымкаў.

### Там, дзе працуюць турбіны

Мы спускаемся ў самае сэрца станцыі — у «падводнае царства», калі можна так сказаць, гідрастанцыі. Дарэчы, ніякага асаблівага ціску зверху не адчувалася, хоць мы і апынуліся на глыбіні дзясяткаў метраў. «Тут знаходзіцца асноўнае абсталяванне — турбіны, генератары, мультыплікатары, — патлумачыў **намеснік галоўнага інжынера Гродзенскіх электрычных сетак Аляксандр ГУНДАР.** — Цяпер упершыню на станцыі вядзецца дасканальны рамонт гідратэхнічнага абсталявання, які пачаўся летась. Паралельна вядзецца мадэрнізацыя валатурбін для надзейнасці. Яны рамантуюцца паступова. Напрыклад, на дадзены момант з пяці турбін працуюць дзве».

Падчас размовы прагучала вобразнае параўнанне станцыі з вялікім кранам, які з дапамогай розных прыстасаванняў ажыццяўляе рэгуліроўку расходу вады з турбіны. Вада, што называецца, не ідзе «ўхаластую». А між тым, прыручыць водную стыхію было няпроста.

Віктар Зубрыцкі ўспамінае, як складана было перасыпаць земляную плаціну: «Вялікія бетонныя пліты лялі, як папера — іх зносіла патокам. Больш за сем гадзін вялася барацьба з ракой, каб вада пайшла праз станцыю. Было ўкладзена 90 тысяч кубічных метраў бетону».

У падводным калідоры на сценах — вялікія фотаздымкі ўсяго працэсу будаўніцтва станцыі. Асабліва ўражваюць масіўныя турбіны. Каб іх пракласці, было вывезена больш за адзін мільён кубічных метраў грунту. Будавалася самая магутная на той час ГЭС у Беларусі. Пастаўкай абсталявання займаліся чэшскія вытворцы. Цікава, што яго кошт складае 20 працэнтаў агульнай сумы, а астатнія 80 працэнтаў прыходзяцца на само збудаванне. І праслужыць яно павінна — ні многа ні мала — ажно сто гадоў. Пакуль прайшло толькі дзесяць. За гэты час станцыя выпрацавала звыш 800 мільёнаў кВт-гадзін.

— Мы пацвердзілі тыя разліковыя даныя, якія былі закладзены ў праект, што сведчыць аб правільных разліках па выкарыстанні патэнцыялу ракі Нёман. Тады мы будавалі самую магутную ў Беларусі ГЭС. Пазней, калі будаваліся Віцебская і Полацкая ГЭС, улічваўся ў першую чаргу, наш вопыт, — заўважыў **генеральны дырэктар РУП «Гроднаэнерга» Віктар ЖУК.** — Гадавы аб'ём выпрацоўкі электрастанцыі адпавядае гадавому спажыванню насельніцтва Гродна ці спажыванню, напрыклад, Шчучынскага раёна.

Сёння ў Беларусі тры гідраэлектрастанцыі такога маштабу. Але спецыялісты лічаць, што водны патэнцыял выкарыстоўваецца ўсяго на некалькі працэнтаў. Між тым, зялёная энергетыка мае ўсе перадумовы для далейшага развіцця. Пры агульным стагадовым тэрміне эксплуатацыі, акупнасць гідрастанцыі складае 25 гадоў.

### Вадасховішча і турызм

Трэба сказаць, што ГЭС паўплывала на з'яўленне новага ландшафту. У рэчышчы ракі Нёман утворана так званае Гродзенскае вадасховішча, яго яшчэ называюць Гродзенскім морам. І нездарма — працягласць штучнага вадаёму складае 43 кіламетры, а плошча — каля дзвюх тысяч гектараў. Гродзенскім райвыканкамам распрацаваны праект адносна тэрыторыі, якая прылягае да вадасховішча. Мяркуецца, што тут будзе вялікі парк адпачынку з актыўным турызмам. Але асваенне тэрыторыі ідзе марудна. Ці падключацца ў якасці інвестараў энергетыкі, невядома. Аднак турыстычную тэму тут не скідваюць з рахунку. Напрыклад, у кірунку прамысловага турызму. Многім, напэўна, было б цікава пабываць на першай сярод самых магутных у краіне і адзінай у Гродзенскай вобласці гідрастанцыі. І падобныя экскурсіі праводзяцца. Праўда, не ў такім шырокім сэнсе, як тое адбываецца на іншых прамысловых прадпрыемствах. Справа ў тым, што аб'ект небяспечны, патрабуе цеснага інструктажу. Знаходзіцца нямала аматараў экстрэмальных сэлфі, асабліва сярод студэнтаў, заўважылі субяседнікі. А вось школьнікі паводзяць сябе больш дысцыплінавана. Па словах нашых гідаў, у экскурсіях нікому не адмаўляюць, на станцыю прыязджаюць і будучыя спецыялісты-энергетыкі і дэлегацыі іншых рэгіёнаў для абмену вопытам.

**Маргарыта УШКЕВІЧ, фота аўтара.**

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

# КВАТЭРЫ БУДУЦЬ І ДАЛЕЙ ТАННЕЦЬ, ТОЛЬКІ НЕ СПЯШАЮЧЫСЯ І ПА ЛЕДЗЬ-ЛЕДЗЬ

***(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)***

Сярод прадаўцоў, якія размяшчалі сваю інфармацыю на мінулым тыдні, знізілі цэны на аб'екты 4 % з іх. Сярэдні памер зніжкі складаў ад 1000 да 3000 долараў. Паказчык квадратнага метра (усярэднены індэкс) за тыдзень знізіўся і склаў 1193 долары. Прадстаўлены індэкс цэн на другасным рынку моцна схільны ўплыву вялікай колькасці аб'яў аб продажы кватэр у асобных новабудоўлях. Сярэдняя цана квадратнага метра без уліку такога ўплыву цяпер 1318 долараў.

Дарэчы, колькасць прапановы аднапакаёвых кватэр за тыдзень вырасла на 3 %, а колькасць двухпакаёвых кватэр павялічылася на 2 %, 3-пакаёвых — на 1,5 %. Сярод раёнаў найбольш прыкметны рост прапаноў назіраўся ў Кастрычніцкім, Заводскім і Першамайскім раёнах. У астатніх — істотных змен у колькасці аб'яў не адбылося.

У структуры прапановы двухпакаёвыя кватэры займаюць амаль 33 % ад агульнага аб'ёму, аднапакаёвыя — 29,5 %, трохпакаёвыя — 29,9 %, а чатырохпакаёвыя — 7,8 %.

Між іншым, сёння ў базе даных знаходзіцца крыху больш за 15 тысяч кватэр. Некаторыя аналітыкі лічаць, што ўжо ў гэтым годзе колькасць іх падрасце за кошт жылля, якое масава здавалася прадстаўнікам IT-сектара.

## Пасля гіперактыўнага жніўня верасень здаецца зацішшам

Сапраўды, досыць шмат аб'ектаў прапануецца для продажу на другасным рынку, а ў новабудоўлях з'яўляецца велізарная колькасць новых метраў. Сітуацыя здаецца пазітыўнай: выраслі прапанова і попыт, колькасць рэальных здзелак некалькі месяцаў не падае, стабільны і курс долара. Што было ў апошні месяц лета і з чым мы ідзём у восень?

**Намеснік начальніка аддзела кансалтынгу і аналітыкі групы кампаній аднаго сталічнага агенцтва нерухомасці Андрэй ЧАРНЫШОЎ** лічыць, што рынак кватэр у летнія месяцы быў вельмі жывы. Адбілася нівеліраванне страхаў, якія ўзніклі пасля лютага. Попыт на куплю кватэр усё лета быў стабільна высокі, прапанова — вельмі шырокая.

Цэны на сталічную нерухомасць летам амаль не зніжаліся, і для гэтага, лічыць эксперт, ёсць аб'ектыўныя прычыны: курс долара стабільны, пакупніцкая цікавасць не падае, у цэлым у эканоміцы цяпер няма знешніх і ўнутраных узрушэнняў.

У параўнанні з вясной гэтага года аб'ём прапановы практычна не змяніўся, за год жа на сталічным рынку колькасць кватэр для продажу вырасла на 10—15 %. Па-першае, на рынак выйшла жыллё, якое стала нявыгадна здаваць пасля сур'ёзнага вяснова зніжэння цэн на арэнду. Па-другое, сваю ролю сыгралі і ўласнікі. Тыя з іх, хто хацеў прадаць хутка, няхай і нядорага, ужо зрабілі гэта. Цяпер засталіся кватэры, якія спакойна прадаюцца праз davераных асоб без зніжэння цэн.

Купляюць цяпер, па даных рэальных здзелак, часцей за ўсё адна- і двухпакаёвыя кватэры — на кожную катэгорыю прыпадае каля 40 % продажаў, здзелак з трохпакаёвымі кватэрамі — прыкладна 15 %, зусім няшмат — каля 5 % агульнай колькасці — са шматпакаёвымі. Так што, кажа эксперт, відавочна, што ў самым незайздросным становішчы цяпер знаходзяцца прадаўцы кватэр з трыма і больш пакоямі — менавіта ім часцей за ўсё даводзіцца рухацца па цане.



**Эксперт па жылой нерухомасці Наталля ЛІТОЎСКАЯ** кажа, што здзелак куплі-продажу нерухомасці ў гэтым годзе больш, чым летам мінулых гадоў: калі раней традыцыйна фіксавалася 1000—1200 здзелак, то ў жніўні 2022-га іх каля 1500.

Па яе словах, даволі шмат інвестыцыйных здзелак. Людзі актыўна ўкладваюць грошы ў нерухомасць, таму што не разумеюць, што з імі рабіць. Яны забралі іх з банкаў, а дома захоўваць неяк страшна.

Амаль усе разумеюць: здаваць кватэру і зарабляць на гэтым цяпер не атрымаецца. Але такіх уласнікаў-інвестараў, па словах эксперта, задавальняе нават тое, што за грошы, атрыманыя ад арэнды, яны могуць нівеліраваць інфляцыю і пакрыць амартызацыйныя выдаткі.

## Новае жыллё зноў у модзе?

Яшчэ адзін трэнд лета — плаўнае вяртанне пакупніцкага попыту на новабудоўлі.

У пачатку вясны, калі мы апынуліся ў сітуацыі дасканалай нявызначанасці, попыт сур'ёзна ўпаў менавіта на доўгачасовыя праекты. Людзі задумваліся, наколькі разумна ўкладваць грошы ў будаўніцтва жылля. Былі асцярогі, што дамы могуць не дабудаваць, што сур'ёзна ўпадуць даходы — і не будзе сродкаў на завяршэнне будаўніцтва ці аздабленне... Тады многія звярнулі ўвагу на другаснае жыллё: там пытанне квадратнага метра можна было вырашыць тут і цяпер. Зараз сітуацыя стабілізавалася, ды і ўзровень цэн робіць новабудоўлі ўсё больш прывабнымі: забудоўшчыкі вымушаны лічыцца з шырокай прапановай і на першасным, і на другасным рынках — і зніжаць цэны.

Успед за чарговай хваляй даверу да новабудоўляў зноў вырас попыт на «еўрадвойкі» (з адной спальняй) і «еўратройкі» (з дзвюма спальнямі), дзе гасцёўня аб'яднаная з кухняй.

Яшчэ вясной і ў пачатку лета мы назіралі вяртанне пакупніцкай цікавасці да хрушчовак і брэжневак. Прычына простая: пакупніку важна, каб у кватэры была мінімальная плошча (а адпаведна, і цана) пры максімальнай колькасці пакояў. А такія кватэры на другасным рынку — гэта гатовае (што было вельмі важна ў перыяд нявызначанасці) жыллё малой плошчы з ізаляванымі пакоямі па нізкай цане. Людзей не палохаў стары фонд: дамы, у якіх прадаваліся такія кватэры, размешчаны ў абжытых раёнах, яны малапавярховыя, большасць з іх ужо перажыло капрамонт.

Але як толькі сітуацыя стала стабільнай, пакупнікі зноў перакінуліся да «еўракватэрак»: тая ж маленькая плошча, але сучасная планіроўка, новы дом — і зноў нястрашна ўкладвацца ў новабудоўлі.

## Цана расці не будзе

Гэтым летам у пакупнікоў нерухомасці быў фактычна адзін крытэрый выбару — цана. Раней людзі былі больш аптымістычныя і, напрыклад, выбіраючы паміж некалькімі кватэрамі, маглі выйсці за рамкі запланаванага бюджэту дзеля лепшай лакацыі. Цяпер — практычна ніколі. Аб'ектыўных перадумоў да павышэння цаны на квадратныя метры няма. Попыт высокі, але неабходна ўлічваць і пакупніцкую здольнасць — а яна наўрад ці расце, бо крэдытаванне звузілася і падаражэла да цяжкіх 20 % і вышэй.

Калі раней, выбіраючы кватэру, напрыклад, у новабудоўлі, практычна ніхто не цікавіўся і не лічыў, колькі будзе каштаваць аздабленне гэтых квадратных метраў — прыцэньваліся толькі да сцен, то цяпер пра гэта думае кожны.

Эксперты прагназуюць, што цэны яшчэ крыху знізяцца. Рынак новабудоўляў зараз уступіў у сур'ёзную канкурэнцыю з другасным жыллём. Аб'ём новых метраў, якія з'яўляюцца ў Мінску, рэкордны. Цяпер на розных стадыях будаўніцтва — 157 дамоў: калі на рынак выйдуць тысячы кватэр у жылых комплексах «Мінск-Мір», «Левада», «Паўночны бераг» і ў Новай Баравой, цэны будуць вымушаныя ісці ўніз. Змяніць гэта можа хіба што павелічэнне даходаў беларусаў — тады попыт вырасце яшчэ больш, а мінская нерухомасць, у прыватнасці, прыцягне пакупнікоў з рэгіёнаў.

Попыт на новабудоўлі цяпер нераўнамерны: штосьці прадаецца вельмі добра, нешта — пакуль так сабе. Але забудоўшчыкі паступова зніжаюць цэны і прыцягваюць пакупнікоў. Гэта можна апісаць так: калі цана метра ў новабудоўлі каля 1000—1100 долараў — продажы ідуць. Хто ўжо знізіў да гэтых значэнняў — прадаюць, хто захоча прадаваць — будзе вымушаны таксама знізіць. Выключэнне, мабыць, «Левада» — яна купляецца і без зніжак.

Але многія разлічваюць на тое, што цэны ў гэтым сегменце яшчэ знізяцца. Наталля Літоўская лічыць, што некаторыя праекты не могуць каштаваць ніжэй чым 1000 долараў за «квадрат» — гэта будзе ў страту. Цяпер цэны часткі новабудоўляў практычна на дне. Калі сітуацыя не зменіцца, больш таннець няма куды. Будаўніцтва будзе скарачацца. Зменіцца ж, але ў процілеглы бок, усё можа, калі на рынак вернуцца даступныя крэдыты, і адразу за гэтым пачне расці кошт жылля.

## 41 тысяча долараў — аднапакаёвая кватэра, двухпакаёвая — 52

Пачым рэальна прадаваліся кватэры ў гарачым жніўні? Сярэдняя цана квадратнага метра аднапакаёвай кватэры стандартных спажывецкіх якасцяў раўняецца 1220 доларам, двухпакаёвыя кватэры трошкі танней — 1070 доларам, трохпакаёвыя — 1030 доларам. Поўны кошт такой адносна бюджэтнай аднапакаёвай кватэры складае 41 тысячу долараў, двухпакаёвай — 52 тысячы долараў, трохпакаёвай — 62 тысячы долараў.

Кватэры, якія ўжо цалкам гатовыя да пражывання, маюць больш высокі каскад цэн. Квадратны метр аднапакаёвай кватэры «да засялення» ацэньваецца ў 1380 долараў, двухпакаёвай — 1310 долараў, трохпакаёвай — 1250 долараў. Крыху больш каштуюць самі гатовыя кватэры: аднапакаёвыя — 45 тысяч долараў, двухпакаёвыя — 59 тысяч долараў, а трохпакаёвыя — 73 тысячы долараў.

У сярэднім жыллё ў Мінску становіцца танней за кошт больш хуткага зніжэння цэн на бюджэтнае жыллё. На дарагія аб'екты прадаўцы змяншаюць цэны ў аб'явах не так ахвотна.

## У рэгіёнах і суседніх сталіцах

У абласных цэнтрах Беларусі кватэры таннелі ў апошні тыдзень толькі ў Віцебску. Другі па цэнах на жылую нерухомасць горад краіны Брэст прыплюсаваў да квадратнага метра 0,5 % (831 долар). Другое месца займае Гродна — 741 долар за квадратны метр (плюс 0,3 %), потым Магілёў — 695 долараў за квадратны метр (без зменаў), Гомель — 669 долараў за квадратны метр (плюс 0,5 %), Віцебск — 626 долараў за «квадрат» (мінус 0,3 %).

У буйных гарадах Мінскай вобласці сярэдні ўзровень цэн на кватэры ўстанавіўся на такіх адзнаках: Барысаў — 624 долара (-0,5 %), Салігорск — 760 долараў (+0,2 %), Маладзечна — 726 долараў (-0,8 %), Жодзіна — 718 долараў (-0,1 %), Слуцк — 567 долараў за квадратны метр (-0,6 %).

За апошні месяц сярэднія цэны квадратнага метра ў доларавым эквіваленце знізіліся ва ўсіх буйных гарадах найбліжэйшых краін. Істотней за астатнія патаненне назіралася ў Кіеве (-16 %) і Варшаве (-5 %).

Цана квадратнага метра ў Кіеве складае 1655 долараў, у Вільнюсе — 2426 долараў, у Варшаве — 2916 долараў, у Санкт-Пецярбургу — 2891 долар, а ў Маскве — 4541 долар.

Надвор'е

# БАБІНА ЛЕТА ПРАЙШЛО МІМА?

## Пакуль з дажджамі і суцэльнымі туманамі

**Ужо трэцяя дэкада верасня, а бабіна лета да нас так і не зазірнула. Толькі першы месяц восені, але сонца свеціць, ды ўжо не грэе. Апошнім часам у краіне захоўваецца прахалоднае для гэтага часу надвор'е з тэмпературным фонам на 1—5 градусаў ніжэйшым за норму. Канец тыдня таксама будзе халаднаваты, але з дажджамі, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У пятніцу на большай частцы тэрыторыі краіны пройдуць дажджы. Днём месцамі магчымы навальніцы. Максімальная тэмпература паветра складзе 9—15 цяпла. У першы выхадны стане цяплей, толькі ледзь-ледзь і часова. У суботу месцамі па краіне прагназуюцца кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах туман. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 2 да 8 градусаў цяпла, днём — ад 10 да 16 градусаў вышэй за нуль.

У нядзелю будзе сонечна. Чакаецца рост атмасфернага ціску і без істотных ападкаў па краіне, толькі ў начныя і ранішнія гадзіны ў паўночна-ўсходніх рэгіёнах невялікія дажджы. У асобных раёнах туман. Тэмпература паветра ўначы плюс 2—8 градусаў, а пры больш працяглых праясненнях месцамі ёсць верагоднасць замаразкаў ад 0 да мінус 2 градусаў. У разгар дня паветра па краіне прагрэецца да 11—17 градусаў.



У апошні тыдзень верасня ўлада над надвор'ем пяройдзе да атмасферных франтоў. Павялічыцца воблачнасць, а кароткачасовыя дажджы ўжо будуць адзначацца ў многіх раёнах краіны. Уначы ўжо не так холадна.

У панядзелак уначы месцамі, а днём на большай частцы краіны кароткачасовыя дажджы. У начныя і ранішнія гадзіны ў асобных раёнах магчымы туман. Тэмпература паветра ўначы будзе вагацца ад плюс 2 да 9 градусаў. Удзень паветра прагрэецца да 11—17 цяпла.

Паводле папярэдніх прагнозаў айчынных сіноптыкаў, у аўторак на большай частцы тэрыторыі краіны сіноптыкі зноў абяцаюць дажджы. У асобных раёнах туман. Уначы стане цяплей, калі тэмпература паветра складзе ад плюс 5 градусаў да 12 цяпла. Днём паветра прагрэецца да 11—17 градусаў вышэй за нуль, а па поўдні — да 19 градусаў з плюсам. У сераду франтальныя раздзелы пакінуць тэрыторыю нашай краіны, і мы апынемся пад уплывам няўстойлівай вільготнай паветранай масы. Месцамі па краіне чакаюцца кароткачасовыя дажджы. Уначы і раніцай у асобных раёнах туман. Тэмпература паветра ўначы — 5—12 цяпла, а ўдзень — плюс 11—18 градусаў.

**Матэрыялы падрыхтаваў Сяргей КУРКАЧ.**

Кіно

# ЖЫЦЦЁ ЯК ЯНО ЁСЦЬ

**У суботу, 24 верасня, на тэлеканале «Беларусь 3» пакажуць фільм Міхаіла Казакова «Пакроўскія вароты», які ўбачыў свет сорак гадоў таму. Тэлевізійная рэтракамедыя па аднайменнай п'есе Леаніда Зорына пра Маскву і масквічоў 1950-х гадоў знаёміць нас з гісторыяй пра людзей, у вобразах якіх заўсёды згадваецца нешта знаёмае...**



...Косцік прыехаў у Маскву вучыцца і селіцца ў вялікай камунальнай кватэры ў сваёй цёткі на Пакроўскіх варотах. Тут ён і знаёміцца з людзьмі, якія жывуць з імі ў суседстве. Маргарыта Паўлаўна падкінула мужа, спецыяліста па мёртвых паэтах, у якога ў руках усё гарыць, і сышла да іншага, у каго ў руках усё працуе. А той спецыяліст па паэтах, аказваецца, закаханы ў медсястру Людачку. Сам жа Косцік мае пачуцці да рэгістратаркі ў загсе. Словам, паўсюль каханне. І ў дадатак гумар, песні Булата Акуджавы, далягляды старой Масквы і настальгія па часе, калі нават дамашнія зладзеі выклікалі спачуванне і сімпатыю.

Дарэчы, перад паказам фільма цікава будзе паглядзець выпуск «Вялікае кіно. «Пакроўскія вароты», дзе аўтары распавядаюць, як складваўся лёс кінастужкі, хто паставіў пад пагрозу яе выхад і чым тая гісторыя адгукаецца нам, аўдыторыі, і сёння.

А на канале «Культура» ў суботу пакажуць беларуска-расійскі фільм "Развітальныя гастролі". Яго рэжысёр Віталь Дудзін зняў у 1992 годзе. Гісторыю чатырох актрыс, што едуць на гастролі, і якіх аб'ядноўвае каханне да аднаго чалавека, пакажуць у вячэрнім эфіры. У кінастужцы адну з галоўных роляў выканала Вольга Астравумава, якая адзначыла 21 верасня сваё 75-годдзе. І перад паказам фільма актрыса ў праграме "Лінія жыцця" раскажа пра сваю сям'ю, шлях да акцёрскай прафесіі і свае тэатральныя і кінаролі.

**Алена ДРАПКО.**

## ШАХМАТНЫ КЛУБ

Выпуск № 155

Прапануем для рашэння задачу Віктара Волчанка (Беларусь) і Відадзі Заманава (Азербайджан), адзначаную пахвальным водгукам на юбілейным конкурсе расійскага шахматнага кампазітара Анатоля Сцёпачкіна *(гл. дыяграму).*




Белыя: Кра3, Лh2, Cf1, Cg1, пп. b3, c4, f5 (7).

Чорныя: Крc3 (1).

Мат за 4 хады.

Дасылайце адказы на адрас рэдакцыі («Звязда», г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А, 220013) або на электронны адрас вядучага аддзела: vadim_ne67@mail.ru

* * *

У Гродне прайшлі першынствы Беларусі па хуткіх шахматах (рапідзе) і бліцы да 8, 10 і 18 гадоў. Прызёрамі ў хуткіх шахматах сталі:

хлопчыкі да 8 гадоў — 1) Кірыл Бабейкін (Мінск); 2) Ілья Казлоўскі (Гомель); 3) Арцём Міхайлюк (Гродна);

хлопчыкі да 10 гадоў — 1) Дамір Булгак (Мінск); 2) Іван Кажадуб (Светлагорск); 3) Мікіта Мазанік (Мінск);

юнакі да 18 гадоў — 1) Міхей Навуменка (Орша); 2) Іван Рунец (Мінск); 3) Міхаіл Спіжарны (Орша);

дзяўчынкі да 8 гадоў — 1) Паліна Кротава (Гродна); 2) Хрысціна Патупчык (Кобрын); 3) Віка Блахіна (Гродно);

дзяўчынкі да 10 гадоў — 1) Ніка Венская (Мінск); 2) Саша Каспяровіч (Мінск); 3) Аліса Малюш (Гродна);

дзяўчаты да 18 гадоў — 1) Ксенія Зелянцова (Мінск); 2) Аляксандра Тарасенка (Брэст); 3) Аляксандра Шабан (Кобрын).

А вось прызавыя тройкі ў бліцы:

хлопчыкі да 8 гадоў — 1) Кірыл Бабейкін (Мінск); 2) Ілья Казлоўскі (Гомель); 3) Ціхан Трафімчук (Брэст);

хлопчыкі да 10 гадоў — 1) Саша Дрозд (Мазыр); 2) Дамір Булгак (Мінск); 3) Іван Кажадуб (Светлагорск);

юнакі да 18 гадоў — 1) Міхаіл Спіжарны (Орша); 2) Міхей Навуменка (Орша); 3) Варвара Палякова (Бабруйск, выступала ў юнацкім турніры);

дзяўчынкі да 8 гадоў — 1) Хрысціна Мельнік (Магілёў); 2) Марыя Панічава (Мінск); 3) Паліна Дражына (Гомель);

дзяўчынкі да 10 гадоў — 1) Ніка Венская; 2) Саша Каспяровіч; 3) Насця Савасцьянчук (усе — Мінск);

дзяўчаты да 18 гадоў — 1) Аляксандра Тарасенка (Брэст); 2) Рэната Аюшава (Мінск); 3) Ксенія Зелянцова (Мінск).

* * *

На Мемарыяле Ігара Курносава па хуткіх шахматах у Чэлябінску (206 удзельнікаў) Дзяніс Лазавік заняў 9-е месца, Кірыл Ступак — 10-е, а Рахіль Эйдэльсон была 36-я з 95 у жаночым турніры. У турніры па бліцы на сайце chess.com (385 гульцоў) Арцём Стрыбук заняў 16-е месца. Прызавую тройку чэмпіянату Брэста склалі Дзмітрый Буланаў, Аляксандр Тарасенка і Аляксандр Алішэвіч.

У Пскове прайшла дзіцячая спартакіяда Саюзнай дзяржавы з удзелам камандаў чатырох рэгіёнаў Расіі і чатырох — Беларусі. Усе тры прызавыя месцы занялі нашы юныя суайчыннікі: 1) Брэсцкая вобласць; 2) Мінск; 3) Мінская вобласць.

* * *

Задача з мінулага выпуску рашаецца 1. Кс6! Правільна адказалі Васіль Жуковіч, Ігар Ананіч, Сяргей Дарошчанка, Уладзімір Ізотаў, Віктар Жук, Васіль Барысевіч, Сяргей Цяльпук.

**Вадзім ЖЫЛКО.**

ТЭЛЕТЫДЗЕНЬ

Сядзі і глядзі

# ПРЫХІЛЬНІКАМ ДАКУМЕНТАЛІСТЫКІ І РЭАЛІЦІ-ШОУ

## Тэлеканалы распачынаюць новы сезон

**Тэлеканалы Белтэлерадыёкампаніі падрыхтавалі шэраг цікавых і пазнавальных навінак. Знайсці сабе праграму даспадобы зможа ў новым вяшчальным сезоне кожны. Таму што чакаюць нас і падарожжы ў мінулае, і знаёмства з нязведанымі мясцінамі Беларусі, і прыгоды ў кампаніі здымачных груп тэлеканалаў.**

Так, на «Беларусь 1» увазе тэлеаўдыторыі прапануюць прэм'ерны цыкл «Працоўны фронт». Праект у 12 серыях раскажа пра тое, як адраджалася Беларусь з папялішча вайны ў 1945—1955 гады. Калі былі разбураны народная гаспадарка, аднаўляліся старыя і будаваліся новыя прамысловыя аб'екты, змагаліся за ўраджай і аднаўленне сельскай гаспадаркі, пасляваенная медыцыны, адукацыі, культуры, спорту... Гэты праект пабудаваны на відэахроніцы, архівах, мастацкіх пастаноўках і інтэрв'ю з экспертамі, што дазволіць прадставіць аўдыторыі разгорнутую карціну падзей таго перыяду. У эфіры выпускі праграмы будуць з'яўляцца раз на тыдзень, а архіў «Працоўнага фронту» і іншых пазнавальных перадач заўсёды ў доступе на партале www.tvr.by і на YouTube-канале «Беларусь 1».

Пашырыўся ў новым сезоне і сегмент забаўляльнага кантэнту ўласнай вытворчасці. Як прыклад, тэлеканал «Беларусь 2» запрашае да прагляду шоу з капарытам беларускай глыбінкі «Я з вёскі». Яго вядучы Васіль Чэхаў — мінчанін, які не ўяўляе свайго жыцця без высокаскораснага інтэрнэту і кавы з кавярні штораніцы, а з хатніх жывёл знаёмы хіба толькі з суседскімі мопсамі. Аднак малады чалавек адважыўся разам са здымачнай групай «двойкі» паехаць у вёску і паглядзець, як там жывецца людзям, якія памянялі мегаполіс на сельскую мясцовасць. А вось пра тое, якія адкрыцці і незабыўныя ўражанні напаткаюць нашага героя ў вёсцы, даведаемся падчас прагляду шоу.



Праект «Камень, нажніцы, папера», які нядаўна адсвяткаваў сваё пяцігоддзе ў эфіры, у новым сезоне будзе распавядаць, як прыгатаваць «масляного барана», як паваражыць на жытнім хлебе і нават раскрые сакрэт валення валёнак па-дрыбінску, а вядучыя праграмы адшукаюць сляды старажытнага Беларускага мора, пабываюць у Цмокавай пячоры і разгадаюць таямніцу аршанскага Стоўхенджа.

У эфіры сацыякультурнага тэлеканала таксама не абыдзецца без прэм'ер. У новым сезоне «Беларусь 3» прадставіць сваім гледачам шэраг праграм, прысвечаных гісторыі нашай краіны і яе выдатным асобам. Цыкл «Памяць зямлі маёй», прымеркаваны да Года гістарычнай памяці, раскажа пра дзесяць знакавых беларускіх мемарыяльных комплексаў, аб іх значнасці і кантэксце стварэння. А з людзьмі, якія паўплывалі не толькі на беларускую, але і сусветную гісторыю, зрабілі вялікі ўклад у развіццё навукі і культуры, пазнаёмімся ў цыкле «Асобы».

Рыхтуецца да выхаду і поўнаметражны дакументальны фільм «Дарога памяці». Дадзеная кінаработа стала вынікам супрацоўніцтва тэлеканала і Беларускага дзяржаўнага музея Вялікай Айчыннай вайны. У аснове стужкі — вандроўкі па маршруце памяці па гарадах краіны, якія здзяйсняліся перасоўнай музейнай экспазіцыяй. Падчас ажыццяўлення праекта гараджане перадавалі ў фонды музея сямейныя рэліквіі і іншыя артэфакты, што маюць сувязь і захоўваюць памяць пра іх родныя мясціны. Прэм'ерны паказ на сацыякультурным запланаваны на панядзелак, 26 верасня. А пасля ў гэты ж дзень гледачоў чакае канцэрт «Мы разам па дарозе памяці».

**Алена ДРАПКО.**


## «Цёплая восень са «Звяздой»

Калі вы падпісаліся на газету «Звязда» на IV квартал або II паўгоддзе 2022 года — запаўняйце картку ўдзельніка, выразайце і дасылайце да 21 кастрычніка 2022 года ў рэдакцыю на адрас: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

Сярод падпісчыкаў 27 кастрычніка 2022 года будуць разыграны 7 кропельных кававарак Holt HT-CM-005 і суперпрыз — маслены радыятар Timberg TOR 21 1507BC. Вынікі будуць апублікаваны ў газеце «Звязда» да 2 лістапада 2022 г.

Прызы можна будзе атрымаць у рэдакцыі да 31 снежня 2022 г. пры падачы квітанцыі аб падпісцы на «Звязду» на IV квартал або II паўгоддзе 2022 г. і пашпарта. Пасля 31 снежня выдача прызоў спыняецца і прэтэнзіі падпісчыкаў не прымаюцца. Умовы рэкламнай гульні «Цёплая восень са «Звяздой» чытайце ў нумары 164 газеты «Звязда» ад 23.08.2022 года.



**Тэлефон для даведак (017) 271 81 53.**
**Тэрмін правядзення гульні — з 1.09.2022 да 31.12.2022.**

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі № 4223 ад 17.08.2022 г. выдадзена Міністэрствам антыманапольнага рэгулявання і гандлю Рэспублікі Беларусь.

**Картка ўдзельніка — падпісчыка «Звязды» на IV квартал або на II паўгоддзе 2022 года**

Прозвішча, імя, імя па бацьку ______________________

______________________________________

Падпіска аформлена і аплачана ў ______________________
*(аддзяленне сувязі)*

______ на IV квартал або на II паўгоддзе 2022 года

Хатні адрас і тэлефон *(абавязкова)* [ ] *(індэкс)* ______

______________________________________

______________________________________

Удачы ў розыгрышы!

## Беларусь 1

**6.00, 7.20, 8.15** Добрай раніцы, Беларусь!
**7.00, 8.00, 9.00, 12.00, 13.00, 15.00, 17.00, 19.00** Навіны.
**7.05, 8.05** Навіны эканомікі.
**7.10, 8.10, 18.15, 23.55** Зона Х (16+).
**9.10** Галоўны эфір.
**10.40, 12.15 Драма «Вяртанне» (16+).**
**13.05, 15.25 Драма «Шчасце можна дарыць» (16+).**
**15.10, 18.00** Навіны рэгіёна.
**17.05** Беларускі час.
**18.35, 19.20 Драма «Доктар Іваноў. Чужая праўда» (16+).**
**21.00** Панарама.
**21.45** Зразумелая палітыка.
**22.00 Серыял «След» (16+).**
**23.35** Арэна.
**0.15** Дзень спорту.

## Беларусь 2

**6.00** «Уключайся!» (12+)
**10.00, 15.00, 22.30** Тэлебарометр.
**10.05** «Новы дзень» (12+).
**10.40** «На тыдзень» (16+).
**11.25 Серыял «Раман без апошняй старонкі» (16+).**
**15.35 «Урфін Джус і яго драўляныя салдаты» (0+).**
**17.05 Серыял «Акваторыя» (16+).**
**18.45 Серыял «Сляпая» (16+).**
**19.15** «Цуд» (16+).
**19.50** «Тры першыя спатканні» (16+).
**20.30, 21.15 Серыял «Практыка» (12+).**
**21.10** Спортлато 6 з 49, КЕНА.
**22.35 «Гаспадыня лёсу». Серыял (16+).**
**23.35** «На кручку» (16+).

## Беларусь 3

**7.00** «Дабраранак».
**7.35, 12.10** «Беларуская кухня».
**8.05, 12.00, 15.00, 20.30, 0.05** Навіны культуры.
**8.15 «Дванаццаць месяцаў». Маст. фільм (6+) [СЦ].**
**10.40** «Нацыянальны хіт-парад».
**11.35** «Навукаманія» (6+).
**12.40** «Наперад у мінулае».
**13.05** «Суразмоўцы».
**13.20, 21.05 «Зорка». Маст. фільм (12+) [СЦ].**
**15.10** «1812. Нашэсце». Дак. фільм (12+).
**16.00 «Жандар жэнiцца». Маст. фільм (12+).**
**17.30** «Люблю і памятаю» [СЦ].
**18.10** «Дарога памяці». Дак. фільм.
**19.00** «Мы разам па дарозе памяці». Канцэрт.
**20.00** «Жывая спадчына».
**20.40** «Калыханка» (0+).
**22.40 «Ішоў чацвёрты год вайны...» Маст. фільм (12+).**

## Беларусь 5

**7.00, 19.20** Хакей. МХЛ. «Дынама-Шыннік» — «СКА-Карэлія».
**8.50** Вынікі тыдня.
**9.35** Міні-футбол. Чэмпіянат Беларусі. «Сталіца» (Мінск) — «УУС-Дынама» (Гродна).
**11.30** Спартыўная цікавасць.
**12.15** Канькабежны спорт.
**14.20** Хакей. КХЛ. «Ак Барс» (Казань) — «Трактар» (Чэлябінск).
**16.20** Піт-стоп.
**16.50** Хакей. КХЛ. «Металург» (Магнітагорск) — «Дынама-Мінск».
**21.50** На мяжы фолу. Футбольны агляд.
**23.20** Фактар сілы.
**23.50** Аўтаспорт. Экстрым-Е. Відэачасопіс.

## АНТ

**6.00, 7.10, 8.10** «Наша раніца».
**6.30, 7.00, 7.30, 8.00, 8.30, 9.00, 11.00, 13.00, 16.00, 18.00** [СЦ], **20.30** Нашы навіны.
**9.10** Контуры.
